Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А.І. Жук
________________ 2008 г.

Рэгістрацыйны № ТД ______________/ тып.

# ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях:**
**1-21 05 01 Беларуская філалогія**
**1-21 05 02 Руская філалогія**
**1-21 05 04 Славянская філалогія**

УЗГОДНЕНА
Старшыня вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі
__________________ У.Л. Клюня
__________________ 2008

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдней спецыяльнай адукацыі
______________ Ю.І. Міксюк
______________ 2008

Першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
__________________ І.В. Казакова
__________________ 2008

Эксперт-нормакантралёр
______________________
______________________ 2008

Мінск 2008

Складальнікі:

**Казакова І.В.,** першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Дзяржаўнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт», доктар філалагічных навук;

**Швед І.А.,** дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства Дзяржаўнай установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», кандыдат філалагічных навук.

Рэцэнзенты:

Кафедра беларускай літаратуры Дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны»;

**Ліс А.С.**, доктар філалагічных навук, загадчык сектара фальклору Дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Купалы і Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці Тыпавой:

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры Дзяржаўнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт» (прат. № 9 ад 28.05.2008 г.);

Навукова-метадычным саветам *філалагічнага факультэта* Дзяржаўнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт» (*прат. № 10 ад 23.06.2008 г.);*

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі (прат. № 1 ад 16.09.2008 г.).

Адказны за выпуск: Казакова Ірына Валер'еўна

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У падрыхтоўцы філолага, выкладчыка, навукоўцы важнае месца займае неабходнасць у глыбокім вывучэнні заканамернасцей і асаблівасцей развіцця традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў ва ўсёй яе разнастайнасці, асэнсаванні ролі і месца фальклору ў новай сацыякультурнай сітуацыі. Таму ў вучэбныя планы па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» ўключана дысцыпліна «Фалькларыстыка», якая прадугледжвае вывучэнне і засваенне студэнтамі пытанняў тэорыі і гісторыі фальклору, гістарыяграфіі фалькларыстыкі, арганізацыі і методыкі палявой працы, сістэматызацыі архіўных фондаў, тэксталогіі і эдыцыйных прынцыпаў. У курсе «Фалькларыстыка» вывучаюцца тэксты не толькі славеснай, але і музычнай, харэаграфічнай, драматургічнай народнай творчасці ва ўсіх іх праявах, формах і адносінах (перадтэкставых, інтэртэкставых і кантэкстных). Фальклор трактуецца як сістэма жанраў, міфалагічных уяўленняў і абрадаў у сучаснай ёй мастацка-духоўнай прасторы. Перспектывы сучаснай фалькларыстыкі звязаны з усведамленнем інтэгральнасці народнай традыцыі і ўключэннем самой дысцыпліны ў агульнанавуковую парадыгму культурнай антрапалогіі пры захаванні свайго безумоўнага значэння. Праблематыка фалькларыстыкі актуалізуецца ў сувязі з пытаннямі вывучэння агульнай і славянскай міфалогіі, этнаграфіі, краязнаўства, гісторыі, айчыннай і сусветнай літаратуры, тэорыі літаратуры, беларускай мовы, культуралогіі і філасофіі. Комплекснае вывучэнне фальклору абяцае вырашэнне шырокамаштабных задач, звязаных з культурна-экалагічнай і сацыякультурнай праблематыкай.

Праграма па курсу «Фалькларыстыка» для спецыяльнасцей 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія» разлічана на 82 гадзіны, у тым ліку 52 аўдыторныя заняткі: з іх – 30 (32) лекцыйных заняткаў, 22 (20) практычныя заняткі. Для спецыяльнасці 1-21 05 04 «Славянская філалогія»: агульная колькасць гадзін – 50, у тым ліку 34 аудыторныя (20 лекцыйных заняткаў, 14 практычных заняткаў). Прамежкавы кантроль на працягу вывучэння курса ажыццяўляецца ў форме кантрольных прац, тэставання. Форма кантролю па выніках вывучэння курса – залік.

Праграма складзена з улікам найноўшых дасягненняў айчыннай і замежнай фалькларыстыкі і грунтуецца на тым лепшым, што было ў папярэдніх праграмах па беларускай вуснай народнай творчасці і беларускім фальклоры. Вывучэнне фалькларыстыкі пачынаецца з разгляду пытанняў спецыфікі фалькларыстыкі як навукі, характарыстыкі яе прадмета і метадаў даследавання, яе ўзаемасувязі з іншымі навукамі; падаецца аналітычны агляд этапаў станаўлення і развіцця фалькларыстыкі і асноўных накірункаў тэарэтычных даследаванняў у гэтай галіне з улікам таго, што развіццё беларускай фалькларыстыкі звязана з агульнымі тэндэнцыямі сусветнай гуманітарнай навукі. Паслядоўная (у адпаведнасці з фарміраваннем на працягу гістарычнага развіцця) характарыстыка вядучых навуковых

накірункаў і школ, якія склаліся ў рамках фалькларыстыкі і сумежных з ёю дысцыплін, не даецца цалкам і падрабязна; вылучаюцца зыходныя тэарэтычныя пазіцыі і галоўныя ідэі, якія маюць непасрэднае дачыненне да вывучэння фальклору. Аб'ём асвятлення матэрыялу пашыраецца пры адначасовым удакладненні і канкрэтызацыі агульнага падыходу. У выніку павінна ўзнікнуць разуменне адзінства прадмета і яго асэнсавання.

Асноўная мэта дадзенага курса – сфарміраваць у студэнтаў навуковае ўяўленне пра фалькларыстыку як навуку пра родавую спецыфіку фальклору, пра заканамернасці і асаблівасці развіцця традыцыйнай вербальнай духоўнай культуры беларусаў ва ўсёй яе разнастайнасці, выпрацаваць навыкі прафесійнага фалькларыстычнага аналізу.

Студэнтам неабходна ведаць:

этапы развіцця фалькларыстыкі, яе прадмет, аб'ект, метады, школы і дзейнасць іх прадстаўнікоў;

характар і прыроду, сутнасць і тэматыку фальклорнай творчасці, яе спецыфіку і агульныя рысы з рознымі відамі мастацтва;

асаблівасці бытавання і функцыянавання фальклорных твораў на розных этапах развіцця; жанравую сістэму і паэтыку фальклору.

Студэнты павінны ўмець:

аналізаваць фальклорныя творы з улікам іх ідэйна-мастацкай цэласнасці ў этнаграфічным кантэксце;

сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці семантыкі і функцыянавання фальклорных твораў розных жанраў, гістарычных перыядаў і субкультур;

выяўляць аб'ектыўныя заканамернасці ўзнікнення, функцыянавання і згасання твораў розных фальклорных жанраў;

характарызаваць фалькларыстычныя школы і напрамкі.

Праграма ўключае спіс рэкамендаванай (асноўнай і дадатковай) літаратуры, у якім як класічныя, так і найноўшыя працы, прысвечаныя праблемам фалькларыстыкі, а таксама пералік даведачных выданняў.

Праграма курса «Фалькларыстыка» адрасавана студэнтам спецыяльнасцей 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» і складзена паводле патрабаванняў адпаведнага адукацыйнага стандарта.

# ПРЫКЛАДНЫ ВУЧЭБНА-ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Нумар тэмы | раздзела Назва раздзела, тэмы | Усяго аўдыторных заняткаў | Лекцыйныя заняткі | Семінарскія практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Уводная лекцыя. Прадметнае поле фалькларыстыкі. Фалькларыстыка ў сістэме гуманітарных навук. | 1 | 1 | |
| 2 | Спецыфіка фальклору. | 1 | 1 | |
| 3 | Гістарыяграфія фалькларыстыкі. | 1 | 1 | |
| 4 | Станаўленне і развіццё славянскай фалькларыстыкі. | 1 | 1 | |
| 5 | Узнікненне і развіццё беларускай фалькларыстыкі. | 1 | 1 | |
| 6 | Тэорыя і гісторыя фальклору. | 1 | 1 | |
| 7 | Арганізацыя і методыка палявой працы. Сістэматызацыя архіўных фондаў і эдыцыйная фалькларыстыка. | 1 | 1 | |
| 8 | Жанрава-відавая сістэма беларускага фальклору. | 1 | 1 | |
| 9 | Замовы. | 1 | 1 | |
| 10 | Каляндарная абраднасць і паэзія беларусаў. | 1 | 1 | |
| 11 | Сямейная абраднасць беларусаў і яе паэзія. | 1 | 1 | |
| 12 | Дзіцячы фальклор. | 1 | 1 | |
| 13 | Пазаабрадавая лірыка. | 1 | 1 | |
| 14 | Балады і жорсткія рамансы. | 1 | 1 | |
| 15 | Парэміялагічныя жанры беларускага фальклору. | 1 | 1 | |
| 16 | Казкі. | 1 | 1 | |
| 17 | Няказкавая проза. | 1 | 1 | |
| 18 | Смехавыя формы фальклорнай прозы. | 1 | 1 | |
| 19 | Народны тэатр. | 1 | 1 | |
| 20 | Заключэнне. | 1 | 1 | |
| 21 | Прадметнае поле фалькларыстыкі. | 1 | | 1 |
| 22 | Жанры і віды беларускага фальклору. | 2 | | 2 |
| 23 | Фальклорная паэтыка. | 1 | | 1 |
| 24 | Аналіз міфапаэтычных мадэлей свету розных жанраў. | 1 | | 1 |
| 25 | Характарыстыка сістэмы кодаў фальклору. | 1 | | 1 |
| 26 | Сімволіка і семантыка міфалагем | 2 | | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | беларускага фальклору. | | | |
| 27 | Аналіз твораў каляндарнай і сямейнай абрадавасці і пазаабрадавай лірыкі. | 2 | | 2 |
| 28 | Аналіз твораў народнай прозы. | 1 | | 1 |
| 29 | Агульнанацыянальнае, рэгіянальнае і лакальнае ў беларускім фальклоры. | 1 | | 1 |
| 30 | Беларускі фальклор у славянскім кантэксце. | 1 | | 1 |
| 31 | Методыка збірання фальклору і пашпартызацыя. | 1 | | 1 |

## ЛЕКЦЫЙНЫЯ ЗАНЯТКІ

### Тэма 1. Уводная лекцыя. Прадметнае поле фалькларыстыкі. Фалькларыстыка ў сістэме гуманітарных навук

Асноўныя пазіцыі ў адносінах да прадметнага поля фалькларыстыкі. Узнікненне міжнароднага тэрміна «фальклор». «Шырокае» і «вузкае» разуменне фальклору ў розных нацыянальных школах (славянскай – перш за ўсё ўсходнеславянскай, заходнееўрапейскай, амерыканскай). Вызначэнні фальклору В.Е. Гусевым як 1) вусна-паэтычнай народнай творчасці, 2) комплексу славесна-музычных, гульнёвых (драматычных) і музычна-харэаграфічных відаў народнай творчасці, 3) народнай мастацкай культуры ў цэлым (у тым ліку выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Славесная, музычная, харэаграфічная, драматургічная народная творчасць: яе праявы, формы і адносіны (перадтэкставыя, інтэртэкставыя і кантэкстныя). Нацыянальная адметнасць беларускага фальклору. Фальклор як прадмет даследавання розных дысцыплін (гісторыка-філалагічных, этнаграфічных, мастацтвазнаўчых). Усеахопныя навуковыя рэсурсы фалькларыстыкі ў вывучэнні родавай сутнасці фальклору, яго структуры, жанравага складу, тэксту, паэтыкі і пад. Метады і прынцыпы вывучэння фальклору. Сутнасць міждысцыплінаранага падыходу ў вывучэнні фальклору. Міждысцыплінарная скіраванасць даследчая праграмы акадэміка М.І. Талстога (пры вывучэнні фальклору Палесся). Сувязь фалькларыстыкі з іншымі навукамі. Традыцыйныя абмеркаванні суадносін паняццяў: «фальклор і этнаграфія», «фальклор і міфалогія» і «фальклор і філалогія» (асобна: літаратура / літаратуразнаўства і мова / лінгвістыка). «Антрапалагізацыя фалькларыстыкі».

### Тэма 2. Спецыфіка фальклору

Традыцыйная вербальная духоўная культура і іншыя сферы народнай культуры: агульныя прыкметы і «ансамблевая» агульнасць. Гістарычныя станы сінкрэтызму фальклору. Фальклорны сінтэз як ператварэнне сінкрэтычнага стану. Тыпы фальклорных традыцый: «архаіка», «класіка», «постфальклор». Гарадскі фальклор. Стадыяльна-гістарычная і сацыяльна-культурная дыферэнцыяцыя фальклору. Навуковая праблема прымянення паняцця «фальклор» да ўсёй культурнай традыцыі ці толькі да асобных этапаў яе гісторыі. Пазіцыя Б.М. Пуцілава ў вырашэнні гэтай прыблемы («Фольклор и народная культура; In memoriam»). Агульнае і адрознае ў фальклорнай і масавай культурах. Вусныя і кніжныя традыцыі: тыпалагічныя і камунікатыўныя асаблівасці.

Здольнасць вуснай традыцыі доўгі час захоўваць і трансліраваць у аднолькавай нязменнасці фальклорныя тэксты (у тым ліку значнага аб’ёму). Спецыфічныя камунікатыўныя механізмы вусных традыцый. Сістэма кодаў

беларускага фальклору. Цвёрдая структураванасць фальклорных тэкстаў. Узроўні праявы спецыфікі фальклорнага тэксту: адметныя форма (шматлікія асаблівасці арганізацыі структураванага тэксту – ад рытмікі да стылю і да кампазіцыі; сінтактыка), яго асобая функцыя (прагматыка) і асобае значэнне (семантыка, сувязь з пазатэкставай рэальнасцю). Вобразнасць і стыль у фальклоры.

Спецыфічныя якасці фальклорнай традыцыі. Вуснасць. Калектыўнасць як праблема бытавання. «Пасіўна-калектыўныя» і «актыўна-калектыўныя» формы. Ананімнасць, варыятыўнасць і стэрэатыпнасць як кардынальныя ўласцівасці фальклору; прырода і аспекты гэтых уласцівасцей. Традыцыйныя формулы, матывы, сюжэты. Міфалагемы беларускага фальклору. Прырода і характар фальклорнай тыпалогіі. Ступень устойлівасці вуснага тэксту ў розных жанрах і традыцыях, узроўні яго вар'іравання. Імправізацыйнасць і традыцыйнасць. Праблемы фальклорнага наватарства. Выканаўца і яго аўдыторыя. Варыянт і інварыянт. Інварыянт і архетып («прататэкст»). Варыянт і версія.

Фальклор і рэчаіснасць. Тэкст і «другое бачанне» (У. Проп). Сублімацыя як адметны светапоглядны прынцып тыпізацыі жыццёвых з'яў у фальклоры. Праблема «гістарызму» фальклорнай традыцыі.

## Тэма 3. Гістарыяграфія фалькларыстыкі

Гістарыяграфія фалькларыстыкі як галіна, якая даследуе гісторыю збірання, публікацыі і апісання фальклору ў цэлым ці яго асобных жанраў і відаў, станаўленне і развіццё самой навукі, узнікненне школ і накірункаў у даследаванні фальклору. Праблемы аб'ектыўнага асэнсавання пэўных перыядаў у гісторыі фалькларыстыкі, раскрыцця гістарычнай праўды, перагляду і ацэнкі культурнай спадчыны, паказу станоўчага і негатыўнага ў тэарэтычным асвятленні пытанняў фальклору ў часы манапалізму марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Традыцыйнае прачытанне гісторыі фалькларыстыкі праз прызму творчых біяграфій знакамітых дзеячаў навукі.

Гістарыяграфія асноўных навуковых накірункаў, якія складаюць сутнасць фалькларыстычнай думкі, і вылучэнне асноўных перыядаў у развіцці навукі на працягу ўсяго XX ст. як асноўныя задачы сучаснай фалькларыстыкі ў галіне вывучэння ўласнай гісторыі.

## Тэма 4. Станаўленне і развіццё славянскай фалькларыстыкі

Зараджэнне славянскай фалькларыстыкі ў рэчышчы агульнаеўрапейскай навукі. Сувязь развіцця фалькларыстыкі з актуальнымі ідэйнымі плынямі. Дзейнасць Дж. Віко, асветнікаў XVIII ст., асабліва І.-Г. Гердэра і ўзнікненне навуковай цікавасці да фальклору ў Еўропе. Распрацоўка канцэпцыі пра універсальныя заканамернасці сусветна-

гістарычнага працэсу, трактоўка развіцця «дзікіх» народаў як ранняга этапу гісторыі чалавецтва. Распрацоўка метаду рэтраспектыўнага аналізу. Зараджэнне параўнальна-гістарычнага метаду даследавання з’яў культуры. Вайна 1812 года як штуршок для павышэння грамадскай цікавасці да культуры Старажытнай Русі і тагачаснага сялянства. Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці народаў постнапалеонаўскай Еўропы і развіццё фалькларыстыкі. Пачатак спецыяльнага вывучэння фальклору і стварэнне першых навуковых накірункаў у еўрапейскай фалькларыстыцы ў канцы 1830-х гг. Уплыў ідэй рамантызму. Адрозненне ацэнак традыцыйнай народнай культуры (ад славянафільскага захаплення ёю, узвышана-эмацыянальнага тлумачэння фальклору, ідэалізацыі міфатворчасці да заходніцкага заспакоена-рацыянальнага ўспрымання). Палеміка паміж прадстаўнікамі розных ідэйных плыняў як штуршок да збірання фальклору і перадумова з’яўлення тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да яго вывучэння.

Роля славянафілаў у збіранні і вывучэнні фальклору (П. Кірэеўскі, К. Аксакаў, У. Даль, А. Гільфердзінг, П. Бяссонаў). Навуковая дзейнасць славянскіх фалькларыстаў А. Вастокава, М. Максімовіча, П. Лукашэвіча, А. Мятлінскага, О. Кольберга, Ж. Паулі, К. Вуйціцкага, Ф. Чэлакоўскага, П. Шафарыка, Я. Колара, К. Эрбена, Л. Кубы, Ч. Смолера, В. Караджыча, І. Багарова, П. Славейкава і інш. Стварэнне зборнікаў, якія ўтварылі «залаты фонд» славянскай навукі пра фальклор. Першыя спецыяльныя даследаванні фальклору славянскіх народаў Г. Кайсарава, А. Галіча, М. Кастамарава, І. Сразнеўскага, І. Бадзянскага, П. Прэйса, А. Міцкевіча, В. Караджыча, П. Шафарыка, Л. Штура і інш. Перайманне фалькларыстыкай у другой палове XIX ст. прынцыпаў, паняццяў, катэгорый мовазнаўства і літаратуразнаўства. Пастаноўка пытанняў паходжання, гістарычнага развіцця фальклору на фоне вырашэння культуралагічных і этнаграфічных праблем.

З’яўленне ў 1850–1860-я гады ў славянскай акадэмічнай філалогіі шэрагу накірункаў, навуковых школ: міфалагічнай (лінгвістычная і салярна-метэаралагічная тэорыі паходжання міфа, тэорыі «ніжэйшай міфалогіі»), міграцыйнай (ці запазычанняў), гістарычнай (У. Мілер, А. Маркаў, Б. і Ю. Сакаловы і інш.); пазней – антрапалагічнай (ці тэорыі самазараджэння сюжэтаў), этнапсіхалагічнай, геаграфічнай (фінскай). Параўнальна-гістарычная школа А. Весялоўскага. Працы В. Фрэйдэнберг. Распрацоўка ў пачатку XX ст. сінхраністычнай тэорыі, якая падрыхтавала глебу для структуралізму, што пашырыўся ў сярэдзіне XX ст. Ф.І. Буслаеў, А.М. Афанасьеў, А.М. Весялоўскі, М. Драгаманаў, Ф. Калеса, Н.Я. Мар, У.Ф. Мілер, Р.Р. Шырма, Ф. Калэса як лідэры навуковых школ. Спробы маладой славянскай фалькларыстыкі ахапіць фальклор ва ўсім спектры яго суадносін з рэчаіснасцю. Выкарыстанне вопыту фалькларыстаў Германіі, Англіі, Францыі.

Аддзяленне да пачатку XX ст. фалькларыстыкі ад этнаграфіі, літаратуразнаўства і мовазнаўства. Удасканаленне метадаў экспедыцыйнай працы ў пачатку XX ст. Пераадоленне існаваўшых у сярэдзіне XIX ст.

ідэалагічных забарон на вывучэнне некаторых жанраў (цэнзурная гісторыя з «Народнымі рускімі легендамі» рускага фалькларыста, міфолага А. Афанасьева ў 1853 г.). Плюралізм поглядаў на развіццё культуры, «шматгалоссе» пунктаў гледжання і падыходаў да фалькларыстычнага матэрыялу. Уключэнне ў фалькларыстыку манументальных жанраў (гістарычныя песні, балады, быліны), духоўных вершаў, замоў, класічнай песеннай лірыкі, прыпевак, жорсткіх рамансаў, абрадавай паэзіі, драматычных відаў традыцыйнай культуры, маўленчых формаў. Развіццё казказнаўства. Этналагічны накірунак прац М. Сумцова, Д. Зяленіна.

Росквіт савецкага краязнаўства і новы ўзлёт фалькларыстыкі ў 1920-я гг. Плюралізм накірункаў і метадаў. Развіццё «гістарычнай школы». Запатрабаванасць яе ідэй у савецкай фалькларыстыцы (вучэнне Маркса пра неабходнасць разгляду кожнай з’явы ў яе гістарычным развіцці). Даследаванні формы фальклорных жанраў (працы Р. Воўкава, А. Нікіфарава, Б. Сакалова і інш.). Прымяненне «фармальнага метаду» да вывучэння эстэтычнай складаючай народнай паэзіі. Адкрыццё Б. Сакаловым прыёму ступеньчатага звужэння вобразаў у песеннай лірыцы. Даследаванне А. Скафтымавым паэтыкі і генезісу былін. Заснаванне школы параўнальна-гістарычнага вывучэння фальклору і сярэдневечнай літаратуры, распрацоўка пытанняў рыфмы ў вершаваных жанрах фальклору рускім даследчыкам В. Жырмунскім. Распрацоўка У. Пропам асноў структуралагічнага метаду («Марфалогія казкі», 1928). Гістарычнае тлумачэнне У. Пропам аднастайнасці чарадзейных казак «Гістарычныя карані чарадзейнай казкі», 1946 г.). Вывучэнне дзіцячага фальклору (Г. Вінаградаў, А.І. Капіца і інш.). Вызначэнне ў канцы 1920-х гг. лінгвастылістычнага накірунку фалькларыстыкі (Н. Грынкова, А. Яўгеньева, Р. Гельгарт). Развіццё фалькларыстычнай лінгвістыкі ў 60-я гг. XX ст.

Звужэнне метадалагічнай факталагічнай базы савецкай фалькларыстыкі ў 1930-я–1950-я гг. Выдаткі экспедыцыйнай работы савецкага часу. Скоўванне развіцця фалькларыстыкі ідэалагічнымі кампаніямі. Пастанаўленне Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў пры Саўнаркаме СССР 1936 г. пра п’есу Дзям’яна Беднага «Багатыры»; навязванне вучоным дыскусіі пра быліны ў сувязі з тэзісам пра арыстакратычнае паходжанне рускага эпасу (які быў вызначальным для «гістарычнай школы»). Вульгарызацыя ідэі гістарычнага развіцця фальклору да прымітыўнай трактоўкі: фальклору першабытнай эпохі, феадалізму, капіталізму, сацыялізму. Зганьбаванне перспектыўнай ідэі параўнальнага вывучэння фальклору, адыход В. Жырмунскага і яго паслядоўнікаў ад фалькларыстычных даследаванняў. Антыкампаратывісцкая кампанія 1948 г., вывад за межы навукі прац рускага фалькларыста А.М. Весялоўскага і ўсіх спроб параўнальных даследаванняў, асабліва прац, пабудаваных на ідэі «запазычвання». Спыненне даследавання дзіцячага фальклору, які нібыта недастаткова выразна выяўляе «спадзяванні і надзеі народныя» і дрэнна ўвязваецца з тэмай працы.

Вульгарызацыя праблемы мастацкага метаду фальклору. Трактоўка

мастацкага метаду фальклору як рэалістычнага. Аб’яўленне Ю. Сакаловым фальклору аддзелам літаратуры, а фальклярыстыкі – адной з асноўных частак марксісцка-ленінскага літаратуразнаўства. Канструяванне «вуснай народнапаэтычнай творчасці» адпаведна савецкім літаратуразнаўчым канонам. Разгляд фальклору як мастацтва слова працоўнага народа. Нараджэнне тэорыі шліфоўкі класічнага фальклору, яго бесперапыннага ўдасканалення. Вылучэнне тэзісу пра народнага апавядальніка, трактоўка казачніка, майстра галашэння і інш. як нявопытных, пачынаючых пісьменнікаў, якім неабходная падтрымка прафесіяналаў-фальклярыстаў. Фармуліроўка супрацоўнікамі Усесаюзнага Дома народнай творчасці тэматыкі, над якой павінны працаваць фальклярысты і апавядальнікі (абарончая тэматыка, тэмы дзяржаўнай бяспекі, Чырвонай Арміі, герояў краіны, сталінскай Канстытуцыі і пад.). Забарона на вывучэнне духоўных вершаў, хрысціянскіх легенд, замоў, заклінанняў, міфалагічных апавяданняў як «родавых плям», якія павінны быць пераадолены сацыялістычнай культурай. Ідэалагічная забарона збірання і вывучэння з’яў тагачаснага фальклору: анекдотаў, блатных песень XX ст., маўленчых формул і пад.

Уключэнне ў сферу ўвагі не толькі вясковага, але і гарадскога фальклору. Пашырэнне традыцыйнай экспедыцыйнай працы. Збіранне рабочага фальклору, песень-аднадзёнак, сацыяльных прыпевак і апавяданняў-успамінаў. Небяспека фіксацыі сапраўднага фальклору (лёс рэпрэсіраваных фальклярыстаў). Нашэсці працоўнікаў НКУС-КДБ на фальклорныя архівы з канфіскацыяй «крамольных» матэрыялаў.

Вяртанне навукі да разнастайнасці метадалагічных пазіцый у 1957–1986 гг. З’яўленне новых канцэпцый. Выхад у 1958 г. другога выдання манаграфіі У.Я. Пропа «Рускі гераічны эпас», прац В. Жырмунскага, якія адкрылі для вучоных новага пакалення магчымасці параўнальна-тыпалагічнага падыходу ў фальклярыстыцы. Вяртанне да паўнавартасных гістарычных даследаванняў (Б.А. Рыбакоў «Старажытная Русь. Казанні. Быліны. Летапісы», 1963). Канцэпцыя міфа Е. Меляцінскага. Міф у даследаваннях Вяч. Іванова і У. Тапарова.

Заснаванне прац цэлага пакалення ўсходнеславянскіх фальклярыстаў у 1960–1980-я гг. на перакананні, што фальклор неабходна вывучаць як цэласную, унутрана звязаную, гістарычна складзеную і зменлівую сістэму, а асобныя жанры разглядаць у іх узаемасувязі з іншымі. Аналіз твораў фальклору як высвятленне іх жанравай прыроды ў сувязі з агульнымі для іх ідэйна-мастацкімі прынцыпамі, з размеркаваннем іх функцый, тэматычнай і структурнай блізкасцю і супадпарадкаваннем (роды, віды, жанры, жанравыя разнавіднасці). Распрацоўка і рэалізацыя навуковых (філалагічных) у сваёй аснове прынцыпаў выдання тэкстаў народнай паэзіі. Грунтоўнае філалагічнае вывучэнне помнікаў народнай паэзіі, заснаванае на прынцыпах жанравай іх спецыфікі і на ўліку такіх прыкмет, як вуснасць, традыцыйнасць, варыятыўнасць, калектыўнасць, ананімнасць, а таксама авалоданне прынцыпамі і канкрэтнай методыкай раскрыцця змястоўных і ўласна мастацкіх асаблівасцей вуснапаэтычных твораў пры засяроджанні ўвагі на

народнапаэтычнай класіцы.

Удасканаленне аналітычнага інструментарыя сучаснай фалькларыстыкі, выкарыстанне метадалагічных набыткаў у тэорыі камунікацыі, сацыялогіі, псіхалогіі, кагніталогіі і інш. Сучасныя тэорыі фальклорнага тэксту. Фальклорны гіпертэкст як натуральная форма суіснавання ў фальклорнай свядомасці розных тэкстаў, звязаных між сабой тэматычна і кантэкстуальна. Прызнанне шматмернасці фальклору як аб’екта даследавання; імкненне пераадолець «лінеарнасць» яго аднабаковых апісанняў; прызнанне таго факта, што аналіз фальклорнага твора павінен прадугледжваць шырокі даследчыцкі гарызонт, які ўключае ўмовы яго з’яўлення і функцыянавання. Комплекснае (ці мульціінтэграцыйнае) даследаванне праблем, якія адносяцца як да ўнутрана ўласцівай (іманентнай) структуры фальклорных тэкстаў, так і да практычнага прымянення (прагматыкі) і кантэкстаў фальклорнай традыцыі. Аналітычны (а не апісальны) падыход у даследаваннях, праведзеных у плане міждысцыплінарнасці, комплекснасці. Пастуліраванне неабходнасці збірання поўнай фальклорнай дакументацыі, з улікам сінкрэтычнай прыроды фальклорнага тэксту як шматмернай з’явы і перш за ўсё сітуацыйнай.

Перспектывы сучаснай славянскай фалькларыстыкі. Цэнтры вывучэння фальклору славянскіх народаў.

## Тэма 5. Узнікненне і развіццё беларускай фалькларыстыкі

Беларускі фальклор у летапісах, дзелавых дакументах і іншых помніках пісьменнасці. Станаўленне беларускай фалькларыстыкі ў XVI–XVIII стст. Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору выхадцамі з Беларусі і рускімі фалькларыстамі ў першай палове XIX ст. Інструкцыя па збіранні фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў (1816–1817 гг.) Віленскага універсітэта і фалькларыстычная дзейнасць М. Чарноўскай. Збіральніцкая дзейнасць і асноўныя палажэнні працы «Аб славяншчыне да хрысціянства» З. Даленгі-Хадакоўскага. Агульная характарыстыка жанраў беларускага фальклору ў кнізе А. Рыпінскага «Беларусь». А. Рыпінскі як пачынальнік параўнальнага вывучэння беларускага фальклору. Апрацоўкі беларускага фальклору Я. Чачотам, Я. Баршчэўскім. Вусная паэзія беларусаў у творчасці А. Міцкевіча.

Распрацоўка ў 1850–1860-я гады ў славянскай акадэмічнай філалогіі розных накірункаў, станаўленне навуковых школ (міфалагічная, міграцыйная, гістарычная; пазней – антрапалагічная, этнапсіхалагічная, геаграфічная) і іх уплыў на развіццё беларускай фалькларыстыкі. Вывучэнне беларускага фальклору Я. Тышкевічам, П. Шпілеўскім, А. Кіркорам. Роля Рускага геаграфічнага таварыства ў актывізацыі збіральніцкай і даследчай дзейнасці ў сферы беларускай фалькларыстыкі.

Развіццё беларускай фалькларыстыкі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Дзейнасць Паўночна-Заходняга аддзела Таварыства ў Вільні (1867).

Друкаванне зборнікаў беларускіх народных песень, складзеных І. Насовічам і П. Шэйнам, у «Запісках Рускага геаграфічнага таварыства па аддзяленню этнагафіі» (1873). Першае навуковае выданне беларускіх прыказак (І. Насовіч). Значэнне для развіцця фальклярыстыкі «Матэрыялаў для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-заходняга краю» П. Шэйна. Крытычная ацэнка зборніка П. Бяссонава «Беларускія песні, з падрабязнымі тлумачэннямі іх творчасці і мовы…» (1871). Беларускі фальклор у працах рускіх міфолагаў. А. Пыпін як гісторык беларускай фальклярыстыкі.

Палескія фальклорныя матэрыялы ў зборніках Д. Булгакоўскага, М. Доўнар-Запольскага; зборнікі песень З. Радчанкі як першыя спробы запісу народнага меласу Гомельшчыны. Вывучэнне народнай культуры беларуска-польскага памежжа У. Дабравольскім. «Беларускі зборнік» Е. Раманава – энцыклапедыя беларускага фальклору. Дзейнасць М. Нікіфароўскага як вучонага-народазнаўцы. Спроба рэканструкцыі архаічнай карціны свету беларусаў А. Багдановічам. Зборнікі народнай прозы і малых жанраў А. Сержпутоўскага. Прынцыпы збіральніцкай дзейнасці А. Сержпутоўскага.

Вывучэнне беларускага фальклору польскімі і чэшскімі даследчыкамі. Фундаментальнае выданне М. Федароўскага «Люд беларускі». Даследаванне народнай культуры беларускага Палесся К. Машыньскім.

Сістэматызацыя і даследаванне асноўных жанраў беларускага фальклору, іх паэтыкі, народнага вершаскладання Я. Карскім.

Арганізацыя фальклорна-этнаграфічнай работы ў Беларусі ў 1920-я гг. Роля Інстытута беларускай культуры і часопіса «Наш край». Захаванне ў першае паслякастрычніцкае дзесяцігоддзе разнастайнасці накірункаў і метадаў фальклярыстыкі. Навуковая дзейнасць І. Сербава, А. Шлюбскага, А. Грыневіча, А. Ягорава, М. Гарэцкага і інш. Разгром савецкага краязнаўства ў 1928 г.

Развіццё фальклярыстыкі ў 1930-1950-я гг. Ідэалагічны дыктат у фальклярыстыцы. Канструіраванне фальклору як прылады ўлады і кантролю. Спробы звесці ўсю разнастайнасць падыходаў у вывучэнні народнай паэзіі да «адзіна правільнага» класавага, сацыялагічнага метаду. Збліжэнне фальклярыстыкі з літаратуразнаўствам. Разгляд фальклору як мастацтва слова працоўнага народа. Выданне псеўданародных твораў у тэматычных зборніках («Чырвоная Армія і абарона Радзімы ў беларускай народнай творчасці», «Ленін і Сталін у беларускай творчасці» і пад.). Тэндэнцыя да вузкай спецыялізацыі навук. Даследчыцка-збіральніцкая праца супрацоўнікаў сектару этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР. Навуковыя працы М. Нікольскага, М. Грынблата і інш.

Арганізацыйная перабудова фальклярыстычнай работы ў пасляваенны час. Стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ў АН БССР. Вывучэнне народнай творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны і сучаснага фальклору. Выданне і вывучэнне беларускіх народных песень (з нотамі) і танцаў.

Развіццё фальклярыстыкі ў 1957–1986-я гг. Павольнае вяртанне навукі

да разнастайнасці метадалагічных пазіцый, паўнавартасных гістарычных даследаванняў. Распрацоўка новых падыходаў да вывучэння фальклору. Сцвярджэнне канцэпцыі складзенай і ўстойлівай сістэмы фальклорных жанраў, якія характарызуюць пэўны этап у развіцці нацыянальнага фальклору; трактоўка гэтай сістэмнасці перш за ўсё як мастацкай. Аналіз твораў фальклору праз высвятленне іх жанравай прыроды ў сувязі з агульнымі для іх ідэйна-мастацкімі прынцыпамі, з размеркаваннем іх функцый, тэматычнай і структурнай блізкасцю і супадпарадкаваннем (роды, віды, жанры, жанравыя разнавіднасці), у сувязі з гістарычна развітымі і зменлівымі іх узаемаадносінамі, з агульным для іх гістарычным лёсам. Пачатак выдання зводу беларускай народнай творчасці з 1970 г.; прынцыпы выдання і структура тамоў зводу. Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне замоў, дзіцячага фальклору, каляндарна-абрадавай паэзіі, народнай сатыры, пазаабрадавай лірыкі, баладных песень і інш. відаў і жанраў беларускага фальклору. Вывучэнне гісторыі беларускай народнай творчасці («Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць. Гісторыка-тэарэтычнае даследаванне», 1967). Выданне вучэбных дапаможнікаў (В. Бандарчык, М. Ларчанка, К. Кабашнікаў, А. Фядосік).

Тэндэнцыі сучаснага этапу ў развіцці фалькларыстыкі. Плённая распрацоўка ідэй, народжаных у эпоху станаўлення савецкай фалькларыстыкі, рэалізацыя акрэсленага ў 1960-я гг. павароту да вывучэння міфалагічных уяўленняў славянскіх народаў. Прынцыповае зблiжэнне фалькларыстыкі з этнаграфіяй. Трактоўка фальклору не толькі як сістэмы жанраў, але як з’явы народнай культуры, якая мае яшчэ такія складаючыя, як сістэма міфалагічных уяўленняў і сістэма абрадаў.

Абмеркаванне пытання недастатковасці «філалагічнага» (у двух сэнсах: які карыстаецца эстэтычнымі крытэрыямі ацэнак і абапіраецца на славесны (вербальны) код) разумення фальклорнага тэксту, якому проціпастаўляецца «антрапалагічная» трактоўка тэксту. Абмеркаванне катэгорыі вуснасці як асноўнага крытэрыя прыналежнасці да фальклору. Разгляд межаў і сучаснага зместу крытэрыя народнасці ў сувязі з даследаваннем пытанняў масавай культуры, гарадскіх легенд, чутак, маладзёжнага, паляўнічага, турысцкага, салдацкага фальклору і пад.

Комплекснае даследаванне беларускага фальклору ў выданнях акадэмічнай серыі «Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка» (2001–2004 гг.), у манаграфіях А.С. Фядосіка, К.П. Кабашнікава, Г.А. Барташэвіч, А.С. Ліса, І.В. Казаковай, А.М. Ненадаўца, І.А. Швед і інш.

Энцыклапедыя «Беларускі фальклор» — першае ў гісторыі нацыянальнай культуры галіновае выданне па праблемах духоўнай культуры беларусаў. Энцыклапедычны слоўнік «Беларуская міфалогія» як спроба рэканструкцыі міфалагічнай мадэлі свету беларусаў.

Выданне зборнікаў па фальклорным рэпертуары асобных рэгіёнаў Беларусі, шасцітомнай навукова-папулярнай серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (пад рэдакцыяй Т.Б. Варфаламеевай) і інш.

## Тэма 6. Тэорыя і гісторыя фальклору

Тэорыя і гісторыя фальклору як сістэма абагульненых навуковых ведаў пра фальклор і яго генезіс. Спецыфіка фальклору, прырода традыцый, суадносіны агульнанацыянальных, рэгіянальных і лакальных уласцівасцей фальклору, прынцыпы гістарычнага вывучэння фальклору і яго сістэмны аналіз як важнейшыя раздзелы тэорыі і гісторыі фальклору.

Асноўныя паняцці тэорыі фальклору: варыятыўнасць (лакальныя і храналагічныя варыянты і версіі) і поліфункцыянальнасць фальклору; роды, жанры і віды фальклору, унутрыжанравыя рэсурсы традыцый. Сюжэты, матывы і іншыя кампаненты фальклорнай структуры ў іх вобразнай і тыпалагічнай характэрнасці, кантамінацыя; стылеўтваральныя фактары ў фальклоры, паэтыка фальклору, асновы народнага вершаскладання, народнай музыкі і пад. як прадмет тэорыі фальклору. Праблемы распрацоўкі тэрміналагічнага апарату фалькларыстыкі. Асноўныя тэарэтычныя падыходы да вывучэння фальклорнага тэксту: тэкст у яго статычным аспекце, тэкст як «аб’ект»; тэкст у яго дынамічным аспекце, тэкст як акт паводзін (выкананне), уключаны ў прагматычны (этнаграфічны) кантэкст.

Сістэма вуснай народнай творчасці ў паслядоўнасці этапаў гістарычных узаемаадносін як прадмет гістарычнага (дыяхроннага) вывучэння ў фалькларыстыцы. Аналіз дынамікі сістэмы на разнастайных узроўнях – аснова дыяхроннага вывучэння фальклору.

## Тэма 7. Арганізацыя і методыка палявой працы. Сістэматызацыя архіўных фондаў і эдыцыйная фалькларыстыка

Арганізацыя і методыка палявой (збіральніцкай) працы як раздзел сучаснай фалькларыстыкі, які вызначае задачы палявой працы, акрэслівае сферу дзейнасці збіральнікаў, яе арганізацыйныя формы, спрыяе авалоданню збіральнікамі тэхнікай запісу фальклору. Методыка збіральніцкай працы. Задачы палявой працы: франтальнае (суцэльнае) абследаванне рэгіёна, выяўленне і запіс твораў аднаго ці некалькіх жанраў; паўторны запіс і інш. Арганізацыйныя формы палявой працы: комплексная, стацыянарная, экспедыцыйная і інш. Інтэрв’ю, апытанне, анкетаванне, тэсты, апісанне як прыёмы збіральніцкай працы. Значэнне кантэксту – тэкставага і пазатэкставага акружэння.

Паняцці «пашпарт тэксту», «фальклорны архіў», «фальклорная адзінка», «справа», «адзінка захоўвання», «каталог», «картатэка».

Эдыцыйная практыка і эдыцыйныя прынцыпы. Задачы фалькларыстычнай тэксталогіі. Праблема распрацоўкі прынцыпаў фармальнай сістэматызацыі фальклору (фальклорных тэзаўрусаў) у сувязі з выкарыстаннем камп’ютэрнай тэхнікі для запісу фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу.

### Тэма 8. Жанрава-відавая сістэма беларускага фальклору

Праблема жанру і віду ў фальклоры. Жанраўтваральныя функцыі семантыкі, зместу і паэтыкі тэксту. Межы вар’іравання фальклорнага твора. Паэтыка жанру як аснова, якая вызначае характар магчымых для тэксту творчых змен. Жанр як тып вобразна-структурнай і кампазіцыйна-паэтычнай арганізацыі ці як мысліцельныя фігуры і структурныя мадэлі, у якія ўкладваецца тыпалагічна спасцігнуты творцамі жыццёвы матэрыял. Празаічнае і паэтычнае маўленне ў фальклоры як жанраўтваральная прыкмета. Жанравая характэрнасць твораў і прынцыпы паэтычнага мыслення творцаў. Верагоднае / неверагоднае, сакральнае / прафаннае, рытуальнае / нерытуальнае як жанраўтваральныя прыкметы ў фальклорнай традыцыі. Спецыфіка мадэляў свету ў розных жанрах.

Агульныя прынцыпы класіфікацыі фальклору (філалагічны, фармальны, функцыянальна-этнаграфічны, сацыяльны, мастацтвазнаўчы). Цыклізацыя ў фальклоры і яе разнавіднасці. Цыкл і жанр. Цыкл і кантамінацыя.

Сістэма беларускай эпікі. Класіфікацыя абрадавай і пазаабрадавай лірыкі. Склад беларускай драматыкі. Малыя жанры беларускага фальклору. Міжжанравыя ўтварэнні. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя жанры беларускага фальклору.

### Тэма 9. Замовы

Азначэнне жанру. Паходжанне, магічнае прызначэнне і лёс замоў. Замовы як рытуал і складаючая народнай медыцыны. Архаічная карціна свету ў замовах. Унутрыжанравая дыферэнцыяцыя замоў: замовы ад хвароб, гаспадарчыя, ахоўныя ад нячыстай сілы, стыхій, звяроў, любоўныя; замовы, звязаныя з сямейна-сацыяльнымі адносінамі. Язычніцтва і хрысціянства ў замовах. Кампазіцыя замоў: зачын, заклінальная формула, эпічная (асноўная) частка, замыканне (заключэнне). Магічная аснова кампазіцыі замоў. Магічная функцыя рытмікі, тропікі, сінтактыкі. Замова і заклінанне, адклясце, малітва.

### Тэма 10. Каляндарная абраднасць і паэзія беларусаў

Народны каляндар. Падзел на чатыры каляндарныя цыклы. Язычніцтва і хрысціянства ў народным календары. Нерухомыя і рухомыя святы. Абрад і міф. Сінкрэтызм каляндарных абрадаў. Каляндарная проза. Малыя жанры календара. Песенныя формы (заклінальныя, рытуальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя), абрадавыя лірычныя песні).

Зімовы перыяд беларускага народнага календара. Рытуальна-міфалагічны змест калядных абрадаў, звычаяў, песень, рытуальных

дыялогаў. Павер'і, прыкметы, варажба. Рытуальныя калядныя гульні, ігрышчы. Шчадроўскія песні. «Пераходныя» святы Грамніцы і Масленіца. Тыпалогія і нацыянальная спецыфіка масленічных песень.

Веснавы перыяд народнага календара. Магічная семантыка абраду «Гуканне вясны». Асноўныя матывы, рытуальна-міфалагічны змест і паэтыка вяснянак. Саракі, Благавешчанне, Вербніца, Чысты чацвер, Вялікдзень – абрады і звычаі. Валачобніцтва і калядаванне. Функцыянальна-тэматычны склад, семантыка валачобных песень. Вобразы адрасатаў валачобных песень. Веснавыя карагодныя і гульнёвыя песні; генетычна-функцыянальная сувязь з магіяй і абрадамі. Юраўскія песні: міфалагічная семантыка вобразаў і матываў. Песні абраду «Ваджэння і пахавання стралы», іх сувязь з «асноўным» славянскім міфам. Функцыянальная прырода абрада «Куст». Траецкія, куставыя і русальныя песні, сувязь з міфалагічнымі ўяўленнямі. Веснавая талака: спецыфіка абраднасці, семантыка і паэтычная прырода песеннага суправаджэння.

Летні перыяд народнага календара. Структура і семантыка абрадаў Купалля. Тыпалогія і паэтыка купальскіх і пятроўскіх песень. Сюжэты купальскіх балад: міфалагічны аспект. Тыпалогія жніўнай абраднасці. Мастацкі свет жніўных песень. Адметнасць талочных песень. Вобразы талакі і гаспадароў.

Восеньскі перыяд народнага календара. Свята Багач. Уздзвіжанне; легенды, звязаныя са змеямі. Пакроў. Дзяды. Восеньскія каляндарныя песні – адметная з'ява беларускага фальклору. Геаграфічнае распаўсюджанне восеньскіх песень; народная тэрміналогія. Тыпалогія і паэтыка восеньскай каляндарнай лірыкі. Прыродны, працоўны, бытавы кантэксты восеньскіх песень. Песні на супрадках. Калектыўныя попрадкі як бытавы кантэкст песень. Піліпаўскія песні. Матыў Каляд у піліпаўскіх песнях.

Лёс каляндарнай абраднасці і паэзіі сёння. Сучасныя даследаванні каляндарнай паэзіі беларусаў.

### Тэма 11. Сямейная абраднасць беларусаў і яе паэзія

Абрады жыццёвага цыклу як «абрады пераходу». Канцэпцыя А. ван Геннепа і яго метад даследавання сямейных абрадаў. Траістая кампазіцыя пераходных абрадаў. Асаблівасці і склад сямейна-абрадавай паэзіі.

